Поэтому было принято решение открыто не выступать против "Соглашения", но провалить его ратификацию руками Верховного Совета, обвинить парламент в радикализме и завершить свой силовой сценарий, сохранив лицо и имея оправдание перед российскими "доброжелателями". Так оно и произошло.

Насколько высоко оценил А. Лукашенко своих сторонников за эту удачно проведенную операцию, говорит то, как устроились бывшие депутаты Верховного Совета в новых структурах государственной власти (смотри итоги голосования).

Как видно из этих списков, некоторые представители демократических сил в парламенте выступили заодно с президентскими сторонниками. Абсолютно ясно, что сделано это было без злого умысла. Скорее всего, этот факт говорит о том, что руководство Верховного Совета не смогло скоординировать действия всех фракций. Накануне рассмотрения проекта в пленарном заседании не были проведены консультации, не была разработана тактика совместных действий, не были спрогнозированы возможные варианты действий противостоящей стороны. С. Шарецкий и окружавшие его должностные лица Верховного Совета находились в некой эйфории от ночных бесед с российским руководством, были самоуверенны в правильности своих действий. А может, таким образом они пускали пыль в глаза депутатам и общественности? Как бы там ни было, но обсуждение "Соглашения" было пущено на самотек.

Уроки новейшей истории говорят о том, что импульсивные несогласованные шаги в большой политике имеют самые тяжелые последствия. Поэтому накануне парламентских и президентских выборов в нашей стране в 2004-м и 2006 годах, при большой вероятности проведения референдума, демократические силы должны четко скоординировать свои действия [illegible]

Знасіліся віцебскія калёсы

З года ў год кіраўнікі віцебскіх транспартных арганізацый, што займаюцца перавозкай пасажыраў, скардзяцца на стратнасць сваіх прадпрыемстваў.

Вось і сёлета, паводле разлікаў, зробленых у гарадскім аўтобусным парку №1 і трамвайна-тралейбусным упраўленні, перавозкі пасажыраў на аўтобусных маршрутах акупаюцца толькі на 66,7%, а на трамвайна-тралейбусных — на 80%. І гэта — нягледзячы на пастаяннае ўмацаванне кантролю за аплатай праезду. Не "зайцы" з'яўляюцца галоўнай праблемай гарадскога транспарту, а зношанасць машын: аўтобусы зношаны на 77%, а трамваі — на 80%. Зразумела, працэнт зношанасці, і гэта, відавочна, невыпадкова.

Для нармальнага абслугоўвання жыхароў неабходна штогод набываць 20 аўтобусаў (кошт аднаго — да 180 мільёнаў рублёў), 19 тралейбусаў (105 мільёнаў) і 6 трамваеў (155 мільёнаў за адзін).

Але гэтыя аптымальныя аб'ёмы папаўнення рухомага саставу хранічна не выконваюцца. Сёлета транспартнікі здолелі набыць толькі 9 аўтобусаў і 2 тралейбусы. Такое сумнае становішча тлумачыцца хранічным недахопам грошай.

Не выкарыстоўваюцца на абнаўленне парку і тыя (даволі значныя) сродкі, якія бюджэт атрымлівае ад падаткаабкладання прыватных пасажыраперавозчыкаў, што працуюць на маршрутных таксі. На больш як пяцідзесяці лініях у Віцебску працуе 300 мікрааўтобусаў, ад кожнага з гаспадароў якіх бюджэт штомесяц атрымлівае 96 еўра за рабочае месца. Але куды ідуць гэтыя грошы: на набыццё новых аўтобусаў ці на чарговы "Славянскі базар", ніхто не ведае.

Сяргей БУКТЕВІЧ.

Знешнегандлёвы абарот павялічыўся, а вось сальда адмоўнае

За 10 месяцаў 2003 года знешнегандлёвы абарот Беларусі склаў 17 мільярдаў 260,3 мільёна долараў ЗША і павялічыўся ў параўнанні са студзенем-кастрычнікам 2002 года на 25,1 працэнта. Вынікі знешнегандлёвай дзейнасці краіны за студзень-кастрычнік 2003 года агучыў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Савіных на брыфінгу ў Мінску.

Аднак сальда знешняга гандлю склалася адмоўным у памеры 1 мільярда 79,5 мільёна долараў і павялічылася ў параўнанні са студзенем-кастрычнікам 2002 года на 379,4 мільёна. З краінамі Садружнасці сальда адмоўнае ў памеры 2 мільярды 28,9 мільёна, у тым ліку з Расіяй — 2 мільярды 118,6 мільёна. З дзяржавамі па-за СНД сальда за студзень-кастрычнік 2003 года склалася станоўчым у памеры 949,4 мільёна долараў. У параўнанні са студзенем-кастрычнікам 2002 года гэты паказчык павялічыўся на 146,7 мільёна.

Вольга ЛАПКАВА.

НОВОСТИ

Взрыв в поезде Кисловодск—Минводы

В результате взрыва в электропоезде, который следовал по маршруту Кисловодск—Минеральные воды, погибли 37 человек, сообщает ИТАР-ТАСС. 15 погибших обнаружили сразу же после взрыва, еще 16 тел спасатели нашли под обломками вагона позднее. Шесть человек скончались в больнице. В результате взрыва ранения получили 153 человека. 103 пострадавших на момент сдачи газеты в типографию находились в больницах. 20 из них — в тяжелом состоянии.

Взрыв произошел в 7.42 по московскому времени в черте города Ессентуки в 400 метрах от центрального вокзала города. Он был настолько мощным, что второй вагон поезда разорвало на две части и он упал на бок. Под разрушенными конструкциями оказались десятки людей. Сразу после взрыва в вагоне возник пожар..

В центре общественных связей ФСБ сообщили об обнаружении трупа смертника, рядом с которым найдены несколько неразорвавшихся гранат.

Позже пришло сообщение, что теракт в электропоезде в Ессентуках совершила террористическая группа из четырех человек, в которую входили три женщины и один мужчина.

Такие данные привел на совещании у президента России директор ФСБ Николай Патрушев, сообщает РИА.

НАТО призывает Россию выводить войска

Совет Северо-Атлантического альянса призвал Россию выполнить обязательства, взятые на стамбульском саммите ОБСЕ, и как можно быстрее вывести войска из Грузии и Молдовы.

"Это позволит создать условия для ратификации странами Альянса и другими государствами договора об обычных вооруженных силах в Европе", — сказано в итоговом коммюнике заседания Североатлантического совета. Ранее министр иностранных дел России Игорь Иванов заявил, что члены Европейского Союза под разными предлогами затягивают ратификацию этого договора.

При катастрофе Ми-8 пострадал премьер-министр Польши

В результате катастрофы правительственного вертолета пострадал премьер-министр страны Лешек Миллер и несколько его сопровождающих, сообщает агентство Рейтер.

Как уточнил пресс-секретарь польского правительства, Миллер сам выбрался из рухнувшего вертолета. Тем не менее он был госпитализирован с подозрением на перелом руки и травму позвоночника.

Катастрофа произошла в 20 километрах от Варшавы в районе Пясечно, уточняет РИА "Новости". Всего пострадали до десяти человек.

Премьер-министр возвращался на вертолете Ми-8 из поездки по юго-западным регионам страны в условиях плохой видимости. По предварительным данным, крушение было вызвано техническими неполадками в одном из двигателей. Второй отказал перед самой посадкой, утверждают очевидцы происшествия.

На месте катастрофы работали 10 машин Пожарной стражи. Полиция перекрыла все дороги в районе аварии правительственного вертолета, добавляет российское агентство.

Германия идет на сближение с Казахстаном

Германия готова увеличить в два раза объемы торговли с Казахстаном в ближайшие три года и развить связи с богатой природными ресурсами страной. Об этом заявил канцлер Германии Герхард Шредер на переговорах с президентом Казахстана Нурсултаном Назарбаевым.

Шредер отметил, что Германия заинтересована не только в нефти и газе, но и в других экономических проектах. Представители немецкого бизнеса, сопровождавшие канцлера в поездке, встретились со своими казахскими коллегами для обсуждения деталей.

По мнению некоторых аналитиков, Средняя Азия с ее богатыми запасами энергии в будущем будет столь же важной, сколь и Ближний Восток сегодня. Считается, что Казахстан может стать одним из лидеров в сфере выработки нефти.

Тбилиси принимает высоких гостей из США

Министр обороны США Дональд Рамсфелд посетил Грузию. Со времени отставки президента Шеварднадзе это будет визит самого высокопоставленного американского чиновника.

До этого представители нескольких правительственных учреждений США провели переговоры с переходным правительством Грузии и пообещали ему экстренную финансовую помощь, в том числе и на проведение президентских выборов. Глава американской делегации, заместитель госсекретаря Линн Паско назвал переговоры конструктивными, а их результаты — обнадеживающими. По его словам, Соединенные Штаты поддерживают новое правительство Грузии и намерены выделить ему 5 млн. долларов экстренной помощи — на пополнение пустой казны.

Этот поезд летит над рельсами

581 километр в час — таков новый мировой рекорд скорости, установленный японским поездом "Маглев", работающем на принципе "магнитной левитации".

Это на 2 километра в час больше предыдущего рекорда, установленного тем же поездом на линии, построенной к западу от Токио. Этот тип поезда отличается от остальных тем, что не едет по рельсам, а летит над ними, опираясь на магнитную подушку и уменьшая таким образом как трение, так и шум.

Важнейшие события в фотографиях

В секторе Газа хоронят трех палестинцев, убитых израильскими военными.

Лоре Буш, жене президента США, привезли рождественскую елку.

Премьера заключительной части киноэпопеи "Властелин колец" прошла в Новой Зеландии.

Подарки от британских детей раздают детям иракского города Ум-Каср.

ГЕРМАНІЯ СЁННЯ

Адвент

На нямецкую зямлю прыйшоў Адвент — шэраг свят, якія папярэднічаюць Калядам. Дамы і вуліцы ўпрыгожваюцца рознакаляровымі гірляндамі і цацкамі. На гарадскіх плошчах ладзяцца кірмашы.

Асабліва любяць гэтыя дні дзеці. У адпаведнасці з традыцыяй, яны атрымліваюць у якасці падарунка каляндарыкі Адвента — своеасаблівыя кніжкі з акенцамі-складамі, колькасць якіх адпавядае колькасці дзён да Каляд. У кожным акенцы схаваны цукерка, пячэнне ці малюнак на біблейскі сюжэт.

Прыгожы ў такі час Берлін, сталіца ФРГ. У апошнія гады горад набыў новы непаўторны воблік. Тут выраслі шматлікія унікальныя збудаванні. Для іх узвядзення былі запрошаны самыя знакамітыя архітэктары. Так, рэйхстаг з яго шкляным купалам абноўлены англічанінам Норманам Фостэрам, а комплекс будынкаў на Патсдамер пляц спраектаваны італьянцам Рэнцо П'яно. Амерыканец Лібенскінд — аўтар непаўторнага яўрэйскага музея, воблік якога ўражвае не менш, чым сама экспазіцыя. А ў адным з берлінскіх атэляў пабудаваны акварыум вышынёй з пяціпаярховы дом, у якім каля 2,5 тысячы трапічных рыб. Унутры акварыума ходзіць ліфт. Знаходзячыся ў ім, ты нібы паглыбляешся ў марскую стыхію. Экскурсія каштуе 13 з паловай еўра.

Берлін глядзіць у заўтра. Абнаўленню паспрыяў ужо згаданы архітэктар Лібескінд. Тут з 1989 года дзейнічае яго офіс і каманда паслядоўнікаў. На пачатку 90-х гадоў ён рашуча выступіў супраць архітэктурнай палітыкі ўчарашняга дня. Яго будынкі ў Берліне — яркія і непаўторныя. Як вядома, ён выйграў конкурс і на забудову Сусветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Йорку, узарванага тэрарыстамі 11 верасня.

Берлін называюць самай вялікай будаўнічай пляцоўкай Еўропы. Некаторыя гавораць: калі вы ў цэнтральнай частцы горада не бачыце шэрага будаўнічых кранаў, значыць, вы забыліся дома акуляры. Прагматызм і практычнасць, позірк у заўтра — вось што вылучае сённяшнюю нямецкую архітэктуру. Таму тут убачыш дзіцячы садок са... шкляным дахам, школу — з зімовым садам і басейнам, прыватны жылы дом — з дахам, які перапрацоўвае сонечнае святло ў электраэнергію, якой асвятляюцца пакоі. Так што Берлін не толькі ўражвае ўсіх, хто трапляе ў яго, але і абуджае думкі аб бягучым і вечным.

Адвент — гэта не толькі перадсвяточныя турботы, але і час роздумаў аб пражытым і заўтрашнім дні. Прынята весці філасофскія гутаркі з блізкімі і знаёмымі. Спецыялісты прадпрыемстваў і фірм таксама "падбіваюць бабкі".

Днямі аўтамабільны гігант, які вырабляе знакамітыя "Мерседэсы", сумесна з ААН правёў Экалагічны форум у Магдэбургу. На ім усплылі шматлікія факты дзейнасці канцэрна, накіраванай на паляпшэнне экалогіі. У прыватнасці, узгадвалі "бразільскі праект", пры ажыццяўленні якога пачалі выкарыстоўваць какосавыя валокны пры вырабе сядзення аўтамабіля. Паколькі такая вытворчасць аказалася паспяховай, вырашылі пашырыць новую тэхналогію на Еўропу і пачалі вырабляць рэчы для аўтамабільнага салона з лёну і пянькі.

Спецыялісты канцэрна дзяліліся ідэямі і планамі. Яны маюць намер пашыраць так званы "бразільскі праект" і на Філіпіны, іншыя рэгіёны, дзе існуюць структурныя падраздзяленні канцэрна.

Хрысціянска-дэмакратычны саюз — буйнейшая апазіцыйная партыя Германіі — у першы дзень Адвента пачала свой з'езд, на якім вызначыла прыярытэтныя напрамкі дзейнасці з мэтай заваяваць сімпатыі шырокіх слаёў грамадскасці. На форуме вызначаны намеры партыйцаў па паляпшэнні медыцынскага страхавання, пенсійнай сістэмы, ды зноў зрабіць Германію лідэрам Еўропы.

Канцлер Германіі Герхард Шродэр сустрэў пачатак Адвента ў Пекіне, дзе ён знаходзіўся з візітам. Пачаў яго з адкрыцця ў кітайскай сталіцы філіяла буйнейшай турыстычнай фірмы Германіі. Канцлер выказаў надзею, што фірма яго краіны адкрые дарогу ў Еўропу для кітайцаў, а еўрапейцам — у Кітай. Шродэр паабяцаў прэм'еру Дзяржсавета Кітая Вэнь Цзябао пасадзейнічаць адмене пакладзенага Еўрасаюзам эмбарга на пастаўку Кітаю ўзбраенняў і пашырэння гандлёвага супрацоўніцтва.

Іван МАКАЛОВІЧ.

На здымках: *на кірмашы; канцлер Шродэр знаёміцца з драконам.*

На какой машине передвигается Буш?

Бронированные автомобили — непременный атрибут богатых и важных персон по всему свету. Машина, на которой передвигается президент Буш, считается самой совершенной из них.

Если вы "лидер всего свободного мира", то от своей машины будете ждать нечто большего, чем простые подушки безопасности. Возьмите, к примеру, президента Грузии Эдуарда Шеварднадзе.

В 1998 году на его колонну напали по меньшей мере 10 хорошо вооруженных людей. Они обстреляли его машину из автоматов, пулеметов и гранатомета. Три человека погибли, однако благодаря броне лимузина — подаренного грузинскому лидеру дружественными западными правительствами — Шеварднадзе уцелел. Германия незамедлительно отправила ему новую машину.

О безопасности лимузина президента Буша известно многое. Он еще более совершенен, чем машина, спасшая Шеварднадзе. Итак, как лимузин может защитить своего хозяина? Есть три главных принципа:

* Защита в момент нападения

* Способность к быстрому уходу с места нападения

* Ответные меры

Что касается защиты в момент нападения, то на таких машинах стекла в салоне толще 6 сантиметров и сделаны из поликарбонатного пластика. Они способны выдержать прямой автоматный огонь.

Стены, крыша и перекрытия пассажирского салона — все это обито броней, особо прочной сталью и другими пуленепробиваемыми материалами.

В настоящее время обладателям бронированных машин важнее, чтобы их лимузин не столько смог перенести нападение, сколько мог быстро уйти в безопасное место. В моделях, про которые говорят, что они обладают "президентским уровнем безопасности", радиатор, аккумулятор и генератор оснащены бронированной защитой, а топливные баки — системой блокировки при взрыве. Кроме того, колеса лимузина сделаны таким образом, что если при нападении повреждается камера (хотя и она является взрывоустойчивой), машина все равно может продолжать движение на высокой скорости, благодаря встроенным в покрышку стальным прутьям.

Машина президента США еще оснащена прибором ночной навигации и инфракрасной камерой для сканирования дороги. Любой предмет или человек, находящийся на дороге на относительном расстоянии от машины, будет спроецирован на лобовое стекло.

Ну и под конец — об ответных мерах. Здесь все просто: у президента США есть целая армия личных охранников, которая всегда под рукой, и бронированную машину вооружать совсем не нужно. Те, у кого большой охраны нет, могут попросить установить в лимузин ракеты и пулеметы.

ЛЮБОПЫТНО

Слепые прозреют с помощью «бионических глаз»

Искусственные глаза становятся реальностью: житель Великобритании, полностью потерявший зрение, видит с помощью "бионического глаза".

71-летнему Кеннету Вайтаману имплантировали под кожу силиконовый микрочип, а к нему выдали специальные очки с мини-видеокамерами.

По словам медиков, принцип действия механизма довольно простой. Сигналы с видеокамер при помощи вживленных электродов стимулируют сетчатку глаза, и пациент видит изображение с видеокамеры.

Пока Кеннет может отличать свет от темноты и распознавать некоторые предметы. Однако говорит, что результатами операции весьма доволен, даже несмотря на высокую цену — "бионический глаз" обошелся ему почти в 100 тысяч долларов.

Чтобы не болеть, надо больше пить...

Потребление достаточного количества воды играет ключевую роль в способности человеческого организма сопротивляться ОРЗ, насморку, головной боли и стрессу.

К такому заключению после проведенного эксперимента пришла группа ученых во главе с британцем Дэвидом Льюисом.

Люди, которые выпивают в сутки не восемь рекомендованных, а только три стакана воды, в пять раз увеличивают риск жить с постоянно заложенным носом и больным горлом.

Англичанка хочет продать себя за полтора миллиарда долларов

Жительница Великобритании выставила себя на торги в интернет-аукционе.

Как передает телекомпания НТВ, 24-летняя англичанка хочет, чтобы ее купили за полтора миллиарда долларов.

Необычный лот сразу привлек внимание, и за него развернулась нешуточная борьба. В итоге стартовая цена выросла в 4 раза.

Участников аукциона не смущают жесткие требования девушки к кандидату — хорошее здоровье, возраст до 35 лет, британское гражданство и... немедленное перечисление денег на счет.

Чаму адкладзены візіт Ніязава ў Мінск?

Як вядома, у канцы мінулага месяца павінен быў адбыцца візіт прэзідэнта Туркменістана Сапармурата Ніязава ў Беларусь. На яго ўскладалі немалыя надзеі. Аднак нечакана ён быў перанесены на вясну наступнага года.

Чаму? Якія прычыны паўплывалі на такое рашэнне? Афіцыйнае паведамленне было сціплым: маўляў, візіт перанесены па ўзаемнай дамоўленасці.

Відаць, таму ў друку выказаны шэраг версій наконт зрыву мінскай сустрэчы ў вярхах. Між тым крупінкі інфармацыі, якія прасачыліся ў прэсу ў апошнія месяцы, высвечваюць яшчэ адну. Спынімся на ёй.

Летась, як вядома, адбыўся візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Туркменістан. Ён меў "нафтагазавую афарбоўку". На прыёме ў гонар высокага мінскага госця прэзідэнт Туркменістана Ніязаў гаварыў: "Мы будзем купляць у вас, Аляксандр Рыгоравіч, сельскагаспадарчую тэхніку. Акрамя таго, мы абгаварылі магчымасць закупкі ваеннай тэхнікі і яе рамонту... Дадаю, што я прапанаваў Аляксандру Рыгоравічу падключыцца, калі ім гэта выгадна, да работы на каспійскіх нафта- і газапромыслах. І мы прадаставім нашым беларускім сябрам пэўныя льготы, калі яны захочуць". У сваю чаргу Лукашэнка адзначыў, што ён чакаў гэтай сустрэчы з нецярпеннем, бо Беларусь вельмі зацікаўлена ў эканамічным супрацоўніцтве з Туркменістанам.

Візіт праходзіў у маі леташняга года. Прыкладна ў гэты час зноў актыўна загаварылі пра туркменскі газ і ва Украіне. Наша паўднёвая суседка мае кантракт на пастаўку адтуль блакітнага паліва да 2007 года, і ён паспяхова рэалізуецца. Украінцы маюць намер заключыць з Туркменістанам новы доўгатэрміновы кантракт на пастаўку газу на 25 гадоў.

Масква хваравіта адрэагавала на актыўнасць сваіх малодшых славянскіх братоў. У расійскіх СМІ з'явіліся выказванні, што на ўсіх можа не хапіць туркменскага газу, ды недаўменне, маўляў, чаму гэта прэзідэнт Ніязаў, толькі што падпісаўшы кантракт з расійскім "Газпромом" на 25 гадоў, тут жа прапанаваў аналагічнае пагадненне і Украіне? У сувязі з чым кіраўнік канцэрна "Нафтагаз Украіны" Юрый Бойка ўступіў у палеміку з такімі выказваннямі і пераконваў, што газу хопіць, а трохкутнік Масква—Кіеў—Ашгабат выгадны ўсім.

Мала верыцца, што яму гэта ўдалося. Вядома, што Беларусь амаль на сто працэнтаў прывязана да расійскіх энерганосьбітаў. Украіна таксама моцна залежыць ад іх. А ў свеце даўно ведаюць, што такога перакосу нельга дапускаць ні ў якім разе. Вядучыя краіны імкнуцца мець не больш за 25—30 працэнтаў энерганосьбітаў з адной крыніцы. Бо інакш можна згубіць сваю эканамічную незалежнасць.

Наша краіна, на жаль, моцным газава-нафтавым ланцужком прывязана да Расіі. Украіна таксама. Гэта дае Расіі магчымасць не толькі дыктаваць свае эканамічныя ўмовы, але і палітычныя. Улічваючы моцную настальгію расійскага грамадства па СССР, жаданне яго эліт аднавіць былую імперыю ў той ці іншай форме, кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, думаецца, зацікаўлена не паслабляць гэтыя "газанафтавыя ланцужкі", якія прывязваюць да яе Беларусь і Украіну, а ўзмацняць іх. Адсюль і такая рэўнасць да сустрэч Ніязава з кіраўніцтвам Кіева і Мінска.

А цяпер давайце ўспомнім, што адбылося пазней у адносінах паміж Расіяй і Туркменістанам. Так-так... Узнік скандал наконт прыцяснення Ашгабатам рускіх. Ён набыў такую вастрыню, што ў яго ўмяшаўся нават прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, які звязаўся па тэлефоне з прэзідэнтам Туркменістана.

Скажаце, а пры чым тут размовы пра газ Мінска і Кіева з Ашгабатам? Гэта было чыста выпадковае супадзенне. Рускіх жа там сапраўды прыцясняюць, у гэтай краіне парушаюцца правы чалавека. Я і сам так думаў. Тым болей што праваабарончыя арганізацыі Расіі і Еўропы б'юць у званы наконт гэтага. Думаў так да таго, пакуль не натрапіў на заключэнне па гэтай праблеме намесніка міністра замежных спраў Расіі Аляксея Фядотава, які пабываў у Туркменістане, на месцы вывучаў праблему, а затым даваў тлумачэнні на парламенцкіх слуханнях у Камітэце па замежных справах Дзяржаўнай думы. Дык вось там, у Думе, намеснік міністра казаў, што сярод расійскіх грамадзян, якія пражываюць у Туркменістане, няма ажыятажных міграцыйных настрояў. Колькасць заяў, пададзеных на набыццё расійскага грамадзянства на працягу 2003 года, па сутнасці, не мяняецца. Іх колькасць склала ў сакавіку — 1319, у красавіку — 1371, у маі — 1671, з верасня па лістапад адпаведна — 1612, 1554, 1321 заява.

Як бачым, бегства з Туркменістана рускіх няма. Ідзе амаль такі ж міграцыйны працэс, як і з іншых былых савецкіх рэспублік. Дык ад чаго такое абвастрэнне сітуацыі? Каментатары еўрапейскіх выданняў звяртаюць увагу на тое, што падобнае абвастрэнне сітуацыі з прыцясненнем рускіх у Туркменістане ўзнікае перыядычна, калі ў гэтым з'яўляецца патрэба, і што ў гэтай праблемы яркае эканамічнае адценне. У прыватнасці, Бі-Бі-Сі днямі спасылаецца на думку туркменскага палітолага, які жыве ў Швецыі, Мурада Ясенава. Ён лічыць, што ўсё ўпіраецца ў эканамічныя інтарэсы, ёсць шмат структур, зацікаўленых у эканамічным супрацоўніцтве з Туркменістанам.

Словам, шмат жадаючых наблізіцца да прыродных туркменскіх багаццяў. Жаданне нашай краіны развіваць супрацоўніцтва з Туркменістанам варта толькі вітаць. Запланаваны на канец мінулага месяца візіт прэзідэнта Ніязава ў Мінск быў, думаецца, таксама прадуманым крокам. Сёлета ж у нас ішлі цяжкія перамовы і размовы з расійскім "Газпромом", які заяўляў то аб павышэнні тарыфаў, то аб выхадзе з ранейшых пагадненняў. У такім разе нават размовы з лідэрам Туркменістана, які мае вялікія запасы газу, мелі вялікі сэнс. Яны маглі б паўплываць на незгаворлівага партнёра з Расіі, які бачыў бы, што Беларусь шукае і можа знайсці і іншага газавага субяседніка. Дарэчы, так у свеце дзейнічаюць амаль усе.

Ды Ніязаў не прыехаў у Мінск. У такі важны момант. Ці не таму, што ў Расіі пачалі ў чарговы раз раскручваць тэму прыцяснення рускіх у Туркменістане? Днямі Дзярждума зноў абмеркавала "туркменскае пытанне", заклікала ўлады і грамадскасць узмацніць ціск на Ашгабат.

Вядома, што ў такой сітуацыі Ніязаву, відаць, не да візітаў, неабходна тэрмінова займацца сігналамі з вялікай Расіі. Пры гэтым, магчыма, падумалі, няхай пакуль Мінск дамаўляецца з "Газпромам", не будзем ім перашкаджаць, можа, гэта неяк залічыцца Расіяй ва ўзнікшай зноў спрэчцы вакол становішча рускамоўных у Туркменістане.

Так гэта ці не, пакажа час.

Сяргей ІВАНОЎ.

Сёлета Сапармурат Ніязаў прымаў у сябе Уладзіміра Пуціна, а вось у Мінск пакуль ніяк не даляціць.

ПОЛЬСКИЙ КАЛЕЙДОСКОП

Благодаря экспорту

Польская экономика развивается прежде всего благодаря экспорту. Однако появились положительные изменения и на внутреннем рынке. Об этом сообщает Главное статистическое управление Польши.

Экспорт, который двигает экономику вперед, вырос за три квартала по сравнению с аналогичным периодом прошлого года почти на 30%. Инфляция, хотя немного выросла, не угрожает экономике. Она ниже, чем в странах ЕС и ниже, чем планировалось на этот год. Об оживлении в экономике свидетельствуют также большие расходы на инвестиции. После снижения на более чем 1% возросли капиталовложения в крупные фирмы, связанные прежде всего с экспортом.

Заем Европейского банка

Европейский инвестиционный банк предоставит Польше полмиллиарда евро на поддержку в использовании структурных фондов ЕС. Соглашение по этому вопросу подписано в Варшаве.

Польша является первой страной, которая пользуется такого рода займом. Эти средства будут предназначены на финансирование строительства дорог и другой транспортной инфраструктуры, а также для малых и средних фирм. Речь идет о проектах, которые вошли в Национальный план развития страны, подготовленный ведомством экономики. Европейский банк предоставил заем на 25 лет. Первый транш Польша сможет получить уже в январе будущего года. Это крупнейший заем, предоставленный Европейским инвестиционным банком Польше за последние 13 лет.

Вайда приступил к работе над «Бесами»

Знаменитый польский режиссер Анджей Вайда принял предложение московского театра "Современник" и приступил к работе над пьесой по роману русского классика Федора Достоевского "Бесы" — сообщило Радио "Голос России". По словам Вайды, "Бесы" — это очень современный роман. В нем великий русский писатель предвидел многие потрясения и несчастья, которые происходят в современном мире, в том числе волну терроризма.

В феврале этого года по случаю Дня памяти Федора Михайловича Достоевского в Санкт-Петербурге состоялась выставка "Федор Достоевский в творчестве Анджея Вайды". В марте в Музее Достоевского при поддержке программы "Культурные связи открытого общества" состоялся семинар "Достоевский и Вайда".

Деятели «Солидарности» побывали у Папы Римского

Папа Римский Иоанн Павел второй, принимая на днях на аудиенции членов профсоюза "Солидарность", подчеркнул, что профосоюз должен вернуться к своим корням, идеалам, которым он был верен в первоначальный период.

В аудиенции участвовали два прежних и нынешний председатель "Солидарности": Лех Валенса, Мариан Кшаклевский и Януш Снядек, а также представители Польской федерации по футболу.

Юбилей Кшиштофа Пендерецкого

По случаю 70-й годовщины со дня рождения выдающегося современного польского композитора К.Пендерецкого в Варшаве состоялся торжественный концерт. В его программе — опера Кшиштофа Пендерецкого "Король Убу" по написанной в 1896 году знаменитой пьесе французского драматурга Альфреда Жарри. Торжественные концерты, приуроченные к юбилею К.Пендерецкого, прошли также в Вене.

Международная известность пришла к Пендерецкому в 1960 году, когда было исполнено его произведение "Плач по жертвам Хиросимы". Затем он писал музыку по заказам ООН, ЮНЕСКО, МОК, сочинял оратории и симфонии к юбилейным датам Французской революции, Иерусалима, Москвы и Санкт-Петербурга, где в этом году был удостоен звания почетного доктора. Кшиштоф Пендерецкий — Почетный член Королевской музыкальной академии в Лондоне и Стокгольме, почетный доктор 17 университетов и Академий, лауреат самых престижных музыкальных премий мира. По заказу ООН Пендерецкий написал оперу "Потерянный рай". Это музыкальное произведение было исполнено миланской Ла Скала, впервые за все время своего существования приглашенной в Ватикан Папой Римским Иоанном Павлом II.

Слишком маленький зал

"Газета выборча" в статье "Слишком маленький зал" пишет о феноменальном успехе выступления польской поэтессы Виславы Шимборской в Риме. Зал на 700 мест оказался переполненным, и далеко не все желающие получили возможность ее послушать. В Рим Вислава Шимборская — лауреат Нобелевской премии в области литературы приехала по приглашению местного института культуры. Вначале встреча должна была пройти в стенах этого учреждения, однако итальянский переводчик стихов Шимборской Пьетро Марчезани решил, что зал будет слишком мал, чтобы вместить всех слушателей, и снял зал Театро Валле — одного из старейших римских театров. Однако и этот зал оказался недостаточно просторным для всех желающих. Вислава Шимборская прочла более десятка своих стихов в оригинале, а переводы читали две итальянки — поэтесса и актриса. Успех превзошел все ожидания. Сейчас в Италии готовится полное собрание сочинений польского нобелевского лауреата, над которым работает Пьетро Марчезани. Поэзия еще не умерла — пишет газета.

В Москве вручены польские награды

На днях в Москве 32 российским ученым и деятелям культуры за выдающийся вклад в развитие польско-российских отношений и популяризацию польских культурных достижений были вручены польские ордена и медали. Четырнадцать их них были удостоены Ордена заслуги.

Подготовил к печати Алесь ДРАБЧУК.

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

Двое на хутары

Памяшканне аўтастанцыі даўно апусцела. Рэдкія аўтобусы, што мала хадзілі з-за недахопу бензіну, адправіліся. Не было пасажыраў. Касірка Зіна зачыніла касу і такама накіравалася дадому, толькі прыбіральшчыца Ганна Аўсяная ўсё нешта корпалася ў зале для пасажыраў. Яна прыбрала вокны, памыла падлогу і, бразгаючы вядром, накіравалася наводзіць парадак у невялічкае бакавое памяшканне, якое нібы служыла дадаткам да залы. Святло там запальвалі рэдка, а цяпер, уключыўшы яго, Ганна са здзіўленнем убачыла, што на лаўцы, згарнуўшыся ў клубочак, спіць невялічкі хлопчык. Кароткая астрыжаная галава нічым не прыкрыта, а ў зале было халаднавата.

Ці то ад грукату вядра, ці ад яркага святла электрычнай лямпачкі хлопчык заміргаў вачанятамі, потым падхапіўся і сеў. У душы бабы Ганны, якая вызначалася суровасцю і нелюдзімасцю, нечакана варухнулася нешта і шкадаванне. Пасля смерці бацькоў яна шмат гадоў жыла адна ў невялічкай хацінцы на хутары непадалёку ад райцэнтра і ўжо даўно не адчувала жалю ні да кога, як не адчувала яго і з боку людзей да сябе. Яна амаль нікалі ні з кім не размаўляла, толькі панура і цярпліва рабіла сваю простую работу: прыбірала памяшканне, мыла і чысціла аўтобусы.

— Цябе пакінулі ці згубілі? — спытала яна ў хлопчыка.

— Неа-а, — замахаў ён стрыжанай галоўкай.

— Тады што? — не адставала баба Ганна.

— Я ўцёк са школы-інтэрната, да хаты. Туды мяне накіравалі, забраўшы ад хворай бабулі. Таткі ў мяне не было нікалі, а мама сядзіць у турме, бо п'яная абакрала нейкага дзядзьку. Яна і кінула мяне. Я гадаваўся ў бабулі, а яна цяжка хварэла. Ёй самой патрэбен догляд. Мяне і запраторылі ў гэты інтэрнат. А праз некалькі дзён прыехаў з нашай вёскі дзед — нейкі далёкі сваяк — і сказаў, што бабуля памерла. Звазіў на пахаванне і назад павёз. А я не хачу быць у тым інтэрнаце, хачу жыць сам, адзін. Ужо даўно дома быў бы, а тут аўтобус не пайшоў. Я чакаў другога ды заснуў.

— Які табе дом, дурненькі, якое жыццё аднаму? — са скрухай прамовіла Ганна. — Зіма на носе, а ў вас, мабыць, і печ паліць няма чым, раз бабка хварэла. А есці што ты будзеш? Так што назад табе, галубок, дарогі няма.

— І ў інтэрнат я не вярнуся, — з недзіцячай цвёрдасцю ў голасе сказаў хлопчык.

І раптам у засохлай, засяроджанай душы Ганны Аўсянай ізноў нешта падобнае на маленькую ласку. Ад гэтага невядомага пачуцця палыпелі ёй вочы, дабрыня засвяцілася ў кожнай маршчыне старога твару. У лёсе хлопчыка яна адчула нешта падобнае на тое, што было ў яе жыцці.

— Нябось есці хочаш? — пацікавілася.

— Хачу, — шчыра прызнаўся хлопчык. — Я збег адтуль перад самай вячэрай.

На сваіх змучаных рэўматызмам нагах Ганна патупала ў закуток, дзе ляжаў яе плюшовік і стаяла нечым напакаваная сумка. Адламала ад свежага бохана добры кавалак, адкруціла ад кружка танкай каўбасы і падала хлопчыку.

— Мне зашмат, — запратэставаў ён.

— Як не з'ясі, то ў сумку схаваеш.

Яна шорстка мокрай анучай па падлозе, а ў галаве панура варушыліся думкі: "Адзінокае дзіця. Век не будзе мець, да каго галаву прыхіліць". І раптам бліскавіцай праняслася: вазьму яго да сябе! Кіну да чортавай маці гэту работу ды буду даглядаць. Хопіць і пенсіі на самае неабходнае. Тым больш што гаспадарка такая-сякая ёсць. Дый немалое ж у мяне дзіця — не агледзішся, як вырасце, можа, мяне старасць сагрэе.

Баба Ганна неяк і не падумала, што хлопчыка ж будуць шукаць і абавязкова знойдуць, што і калі ён і пагодзіцца жыць у яе, то яго ж у кішэні насіць не будзеш. Людзі даведаюцца і паведамяць уладам.

Памыўшы падлогу, яна прыбрала ў закутак свой няхітры інвентар, спаласнула рукі і выпаліла на адным дыханні:

— Пайшлі жыць да мяне. Я табе замяню бабулю і ні ў які інтэрнат не аддам.

Баялася, што адмовіць, не пагодзіцца, а ён аж засвяціўся ўвесь:

— Праўда?! — уздыхнуў, нібы якую хваробу з сябе скінуў.

— То няўжо ж я буду цябе падманваць? — упершыню за многія гады па твары Ганны Аўсянай прабегла нешта падобнае на ўсмешку.

Назаўтра старая звольнілася з працы, і яны з малым Юркам сінем сядзелі на хутары. Ганна адлучалася з дому толькі ў райцэнтр, дзе ў магазінах прадукты. Гэта было звычайна раніцай, як пакорміць парсючка да казу. А потым яны ўдваіх лушчылі фасолю, разматвалі з клубкаў ніткі. Словам, якой — не тужылі. Адтала ад адзіноты Ганніна душа, а Юрка не мог нарадавацца, што не трэба вяртацца ў інтэрнат, дзе ненавісны таўстун Генка прыдзіраўся з-за ўсякай драбязы, неўзлюбіўшы невядома за што, моцна біўся. Пра вучобу ён не думаў, бо ніколі асабліва не цягнуўся да кніжак. Ды і наогул Юрка цяпер ні пра што не думаў. Было добра і ўтульна ў цёплай хаце бабулі Ганны, дзе пахла сушанай мятай і дзе так слаўна мурлыкаў чорны кот, было масла толькі ўзяць яго на калені.

Так міналі дні. Аднойчы вечарам яны пілі чай і глядзелі тэлевізар. І раптам на экране з'явілася Юркава фотакартка. Прыгожая жанчына паведаміла, што прапаў хлопчык, і калі хто ведае, дзе ён знаходзіцца, то няхай паведаміць у міліцыю. На бабу Ганну нібы хто выліў вядро. Яна ўхапілася за край стала і скамкала ў руцэ абрус. Сцяўся, нібы падбітая птушка, і Юрка.

— Што рабіць будзем, дзіцятка? — пабялелымі вуснамі прашаптала Ганна.

— Маўчаць! — перапалохана крыкнуў Юрка. — Зноў у інтэрнат? Зноў пад Генкавы кулакі? Ні за што не пайду!

— Падумаем, — коратка сказала Ганна.

Яна думала ўсю ноч. А раніцай, калі толькі ў вокны пачало сачыцца скупое восеньскае святло, пабудзіла хлопчыка.

— Трэба ісці ў той інтэрнат. Нельга мне маўчаць. Грэх. Вызводзіць, што я цябе ўкрала. Людзі ж там непакояцца, бачыш, міліцыю на ногі паднялі, па тэлебачанні перадалі. Пойдзем, але я цябе ў крыўду не дам.

Яны выйшлі з дому, калі ўжо добра развіднела. Хадзілі доўга. Не дзень і не два, а з адной установы ў другую, ад аднаго начальніка да другога. Плакалі, угаворвалі, але свайго дамагліся: састарэлай Ганне Аўсянай дазволілі ўсынавіць Юрку Грыўчыка, і ён таксама стаў насіць прозвішча Аўсяны.

Леанард ЮРГІЛЕВІЧ.

Зацверджаныя адзіныя правілы прыёму ў ВНУ

Пастановай Міністэрства адукацыі Беларусі зацверджаны адзіныя правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы ў 2004 годзе. Аб гэтым паведаміў міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў на пасяджэнні калегіі міністэрства.

Паводле яго слоў, для паступлення ў ВНУ у наступным годзе ўведзены абавязковы ўступны экзамен па рускай альбо беларускай мовах (на выбар абітурыента). 30 мая пройдзе экзамен па беларускай мове, 6 чэрвеня — па рускай мове. 13 чэрвеня — рэзервовы дзень для тых, хто па ўважлівых прычынах не змог прыйсці ў прызначаныя дні. Два іншыя ўступныя экзамены абітурыенты будуць здаваць па профілі абранай спецыяльнасці. З гэтай мэтай спецыяльнасці падзелены на групы, кожнай з якіх будуць адпавядаць пэўныя экзамены, што прызначаны ва ўсе ВНУ, сказаў міністр.

Згодна з новымі правіламі прыёму ў ВНУ, уступныя экзамены па-ранейшаму будуць праходзіць у два патокі: у дзесяць вядучых ВНУ — з 2 па 8 ліпеня, у астатніх — з 18 па 24 ліпеня.

Вольга АСІПЕНКА.

ДИСКУССИЯ

Жизни военного не позавидуешь

Я — военный пенсионер, старший офицер. Прочитав письмо В.Акупенко, возмутился. Так заявлять может только человек, абсолютно не знающий жизни, не служивший в армии, не испытавший на себе ее тяготы и лишения. Поверьте, не лучшие времена наступают для семей военных пенсионеров и после увольнения в запас.

Вот мой пример. За время службы — 12 переездов к новому месту (Латвия, Литва, Дальний Восток, опять Литва). Что это такое, может понять только тот, кто сам испытал подобное. Жена не всегда может устроиться по специальности или найти хоть какую-нибудь работу. Результат — нет стажа для пенсии. Детям (у меня три дочери) едва ли не каждый год приходилось учиться в новой школе. А это новый коллектив, трудности "притирки" к новым людям. А добираться в школу в тайге или вдали от в/части?

Сейчас мои дочери взрослые, работу кое-как имеют, но живут все по чужим углам. Сам я живу в квартире в деревне, так как на городскую не хватило денег. Так что и теперь вся моя семья очень даже надеется на мою помощь (из пенсии). А ведь мы с женой уже не молоды, здоровье подводит, требуется лечение, а оно теперь дорогое.

В.П.СТАРОВОЙТОВ, 63 года, майор запаса.

ГЛЫБІНКА

Такая пакутлівая старасць...

Даволі тыповая сітуацыя склалася ў вёсках Даўгапольскага сельсавета Гарадоцкага раёна. З таго часу як некалькі размешчаных тут калгасаў "рэфармавалі", аб'яднаўшы пад шыльдай адкрытага акцыянернага таварыства (ААТ) "Гарадоцкі райаграпрамснаб", кіраўнікі новага сельгаспрадпрыемства з пагардай адвярнуліся ад калгасных пенсіянераў з іх надзённымі патрэбамі. Старым, нямоглым сялянам, якія не маюць сіл апрацоўваць свае прысядзібныя ўчасткі, нарыхтоўваць кармы для хатняй жывёлы, акцыяніраваная гаспадарка не хоча дапамагаць. Дайшло да таго, што службовыя асобы калгаса "Чырвоны Кастрычнік", уключанага ў аб'яднанне "Гарадоцкі райаграпрамснаб", развозячы штатным працаўнікам гаспадаркі выдзеленае ім цюкаванае сена для прыватных кароў, абмінулі двор пенсіянеркі Марыі Каваленка, удавы загінуўшага на фронце салдата Вялікай Айчыннай вайны, былой даяркі, якая адпрацавала ў згаданым калгасе больш за 40 год.

Марыі Яўхімаўне не далі сена, спаслаўшыся на тое, што ў яе ёсць дарослы сын, які абавязаны дапамагаць маці нарыхтоўваць корм для рагуль.

Чыноўнікі ААТ "Гарадоцкі райаграпрамснаб", куды ўвайшоў калгас "Чырвоны Кастрычнік", не прынялі пад увагу тое, што сын састарэлай жанчыны жыве ў Наваполацку, з'яўляецца інвалідам другой групы і яму вельмі цяжка касіць траву па няўдобіцах.

Жыхары вёсак Даўгапольскага сельсавета Гарадоччыны падобраму зайздросцяць пенсіянерам саўгаса "Задняпроўскі" Аршанскага раёна, дзе ветэранам працы і ўсім людзям паважанага веку не адмаўляюць ні ў якой дапамозе: выдзяляюць, калі на тое ёсць патрэба, і грузавік, і трактар, і касілку. А сёлета на прыватных збожжавых палетках сялян шчыраваў новенькі нямецкі камбайн.

У Марыі Яўхімаўны Каваленка зусім іншае становішча. Кіраўнікоў гаспадаркі, якой жанчына аддала амаль усё свядомае жыццё, не турбуе лёс пенсіянераў. Бюракратаў не цікавіць, чым будзе карміць зімой сваю жывёлу ўдава абаронцы Радзімы і як яна сама перажыве зіму.

Дагэтуль М.Каваленка ўтрымлівала дзвюх кароў, малаком ад якіх дзялілася з дзяржавай. Цяпер жа, пасля таго як родны калгас яе пакрыўдзіў, не надзяліўшы сенам, пенсіянерка задумалася: ці варта наогул мець жывёлу?

Калі б пра непрыемнасці былой даяркі расказалі жыхарам вёскі Падмошша Чашніцкага раёна, яны б нікольні не здзівіліся. Вёсачка, дзе жывуць гэтыя людзі (таксама ў большасці — пенсіянеры), туліцца на мяжы з Міншчынай, далёка і ад Чашнікаў, і ад Віцебска, і ад цэнтра свайго сельсавета. Так што няма каму паскардзіцца на свае няшчасці і турботы. А яны ёсць і даволі сур'ёзныя. Усе жыхары Падмошша даўно скасілі сваё збожжа, але копы яго дагэтуль стаяць неабмалочаныя. Летась гаспадарам тутэйшых сядзіб пашанцавала. У саўгасе "Слідчаны", на тэрыторыі якога знаходзіцца вёска Падмошша, працавалі камандзіраваныя камбайнёры з поўдня Беларусі, якія (праўда, не бясплатна) дапамаглі пенсіянерам абмалаціць збожжа. Саўгас і тады застаўся ў баку ад патрэб ветэранаў і сёлета не захацеў ім дапамагчы. Няма ў Падмошшы тэлефоннай сувязі з райцэнтрам і наогул з "вялікай зямлёй", як называюць вяскоўцы ўсё, што знаходзіцца па-за мяжой сельсавета.

Вось і не могуць пенсіянеры ні "хуткую дапамогу" паклікаць, ні дзецям патэлефанаваць.

Перастала наведваць Падмошша аўталаўка. Адзіны тавар, які двойчы на тыдзень дастаўляецца ў забытую ўсімі вёсачку на коннай павозцы, — хлеб.

На фоне гэтых непрыемнасцяў праблемы пасёлка Ноўкі Віцебскага раёна могуць здацца нязначнымі. Але жыхарам гэтай недалёкай ад Віцебска вёскі таксама крыўдна ад няўвагі чыноўнікаў. Шмат год ноўкінцы вымушаны піць іржавую ваду. Яшчэ шэсць год таму дырэкцыя саўгаса "Рудакова", на тэрыторыі якога знаходзіцца Ноўка, падрыхтавала дакументацыю на будаўніцтва станцыі па ачыстцы вады ад жалеза, а ў 1998 годзе пачалося ўзвядзенне такога патрэбнага для людзей аб'екта, долевы ўдзел у будаўніцтве якога бралі, акрамя саўгаса, аблвыканкам, Міністэрства па прыродных рэсурсах і ахове навакольнага асяроддзя. Не застаўся ў баку ад узвядзення аб'екта і Дзяржкамітэт па чарнобыльскіх праблемах, бо сярод 3,5 тысячы жыхароў Ноўкі шмат перасяленцаў з чарнобыльскай зоны.

Пяць год таму ўжо былі зроблены артэзіянскія свідравіны, пракладзены вадаводы, пабудавалі нават памяшканне самой станцыі абезжалезвання. На ўсё гэта пайшлі вялікія сродкі.

Але сёлета ў лютым, калі дырэктар саўгаса "Рудакова" пайшоў на пенсію, будоўля спынілася. Новаму кіраўніцтву адной з буйнейшых агароднiцкіх гаспадарак вобласці чыстая вада аказалася непатрэбнай.

Жыхары Ноўкі не супакоіліся. Яны дабіліся таго, што абласны Камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выдзеліў на заканчэнне станцыі 160 мільёнаў рублёў. Тым не менш ажыўлення на будоўлі няма. Выдзеленыя на завяршэнне аб'екта сродкі не асвойваюцца, бо кіраўнікі саўгаса і раёна не зацікаўлены ў тым, каб тысячы жыхароў пасёлка Ноўка пілі чыстую ваду, а не чорную, небяспечную для здароўя вадкасць.

Але вернемся да пенсіянераў Даўгапольскага сельсавета Гарадоцкага раёна. Узорам здзеку над старымі, нямоглымі і, мякка кажучы, небагатымі людзьмі з'яўляецца ўвядзенне згаданым ААТ "Гарадоцкі райаграпрамснаб" платных паслуг для сялян. Калі вы з'яўляецеся працаздольным работнікам гэтай аб'яднанай акцыянернай гаспадаркі, вам выдзеляць тону сена за 8300 рублёў, а калі вы пенсіянер, то павінны заплаціць за тое ж сена у 7 разоў больш — 61 тысячу! Што застанецца ў ветэрана працы ад пенсіі пасля аплаты сена і як стары чалавек будзе жыць, нікога не цікавіць.

..."Ніхто не забыты, і нішто не забыта". Гэты ўзнёслы па форме, але фальшывы па сутнасці лозунг тым часцей будзе сустракацца на старонках афіцыйных газет, на радыё і тэлебачанні, чым хутчэй мы будзем набліжацца да 60-годдзя Перамогі. Чарговая круглая дата абяцае шмат яскравай прапагандысцкай паказухі, але, як звычайна, амаль нічога не зменіць у гаротным жыцці тых суайчыннікаў, якія вынеслі вайну на сваіх плячах. Гэтыя людзі ў большасці сваёй няшчасныя, бо пакутуюць ад галечы, ад хранічнай няўвагі з боку дзяржавы. Пераважная колькасць сведкаў і ўдзельнікаў вайны жыве ў вёсках, дзе пенсіянеры пачуваюць сябе нікому не патрэбнымі...

Сяргей БУТКЕВІЧ.
Фота ByMedia.net

СТРАНИЦЫ ИСТОРИИ

Крах

Одни войны быстрее стираются из памяти современников и потомков, другие прочно в ней сохраняются. И сколько ни пройдет лет, историческая память вновь и вновь будет возвращать к временам незабвенной славы, особенно если эта слава народная.

